**Стальмачонак, Л.** Вайна ў сэрцы юнака / Л. Стальмачонак // Браслаўская звязда. – 2016. – 20 лют. – С. 3

# ВАЙНА Ў СЭРЦЫ ЮНАКА

*Вось ужо 27 гадоў аддзяляюць нас ад дня вываду войск з Афганістана. За гэты час многае сціраецца з памяці, але воіны-"афганцы" не забываюць пра тое, што давялося перажыць.*

Анатоль Сяліцкі нарадзіўся ў вёсцы Чэрнева ў 1960 годзе. Пасля школы працаваў у калгасе трактарыстам, а праз паўгода атрымаў павестку ў армію. Справілі "провады", і Анатоль паехаў у Віцебск, але адтуль яго вярнулі, сказалі, каб чакаў выкліку зноў. Тады хлопец паехаў на заробкі ў Даўгаўпілс, дзе ўладкаваўся працаваць на завод. Там і атрымаў павестку зноў.

Вучэбную падрыхтоўку праходзіў у Рызе ў артылерыйска-зенітным палку. Праз некалькі месяцаў узмоцненай падрыхтоўкі іх групу перавезлі ў Калінінград, а яшчэ праз месяц адправілі ў Афганістан.

Анатоль Сяліцкі ўспамінае:

– Ведалі, куды нас адпраўляюць, але страху не было. Нават і думкі не ўзнікала ў той час, каб як-небудзь "адмазацца". Загадалі – значыць так трэба. Ды і адкуль мог быць страх, мы яшчэ не ведалі, што нас чакала, – працягвае свае ўспаміны Анатоль Фердзінандавіч. – Па чыгунцы пераправілі ў Тэрмез, там салдаты атрымалі баявую зброю, тэхніку. Каб трапіць у Афганістан з Узбекістана, прыйшлося рабіць пераправу праз Амудар'ю. Калі ўсё было зроблена, на аўтамабілях дабіраліся да месца службы. Спыніліся ў даліне Пулі-Хумры, пачалі расстаўляць палаткі і наладжваць у гэтым чужым, зусім непрыветлівым месцы свой быт.

У мотастралковым палку, дзе давялося служыць Анатолю, яму даручылі гармату, якую, акрамя яго, абслугоўвалі яшчэ 3 салдаты: наводчык і 2 байцы.

Ні днём, ні ноччу спакою не было. Ноччу займаліся аховай палка, выходзілі на пазіцыі, а днём падымаліся па трывозе і выконвалі баявыя заданні. Самае цяжкае – пераезд на новае месца, – з сумам у вачах працягвае мой суразмоўца, – бо ніколі не ведаеш, вернешся жывым ці не. Так, напрыклад, аднойчы ноччу выехалі на баявое заданне. Ехалі амаль 3 гадзіны, тады яны здаліся вечнасцю, бо ўсе ведалі, што жыццё кожнага магло абарвацца на гэтай дарозе ў любы момант. Хто служыў у Афганістане, ведае, што большая колькасць нашых салдат гінула менавіта падчас пераездаў. "Духі" любілі падпільноўваць савецкія калоны, мініраваць дарогі.

Анатолю пашанцавала – ён ні разу не быў паранены.

Падчас службы давялося прыехаць у водпуск на 10 дзён дадому. Але бацькі пра тое, дзе служыў іх сын, нават і не здагадваліся. Як жа цяжка было пакідаць родны дом і зноў вяртацца ў тое пекла. Але выбару не было. У маі 1981 г. А. Сяліцкі дэмабілізаваўся.

Сёння ў Анатоля Фердзінандавіча вялікая сям'я: чацвёра дзяцей, тры ўнучкі, а ў хуткім часе чакаецца нараджэнне доўгачаканага ўнука.

Менавіта такая вялікая і дружная сям'я дапамагае жыць і радавацца нават у самыя цяжкія хвіліны жыцця. «Галоўнае, каб не было вайны ды каб родныя былі здаровыя, а ўсё астатняе магчыма пераадолець» – падагульніў мой субяседнік.

Анатоль Сяліцкі, як і ўсе воіны-інтэрнацыяналісты, не любіць многа расказваць пра вайну, бо цяжка ўспамінаць тыя падзеі... Але гэтыя ўспаміны патрэбны для ўсіх нас як прыклад рашучасці, мужнасці і патрыятызму.

***Людміла Стальмачонак***